# БІЯГРАФІЯ АЙЧЫННАЙ ЭТНАЛОГІІ Ў АСОБАХ: ГАННА МІКАЛАЕЎНА КУРЫЛОВІЧ
# BIOGRAPHY OF NATIONAL ETHNOLOGY IN PERSONS: HANNA MIKALAEUNA KURYLOVICH

Ірына Бачыла,
Мінск, Беларусь

Ключавыя словы: даследчыца, беларуская этналогія, культура беларусаў.

Рэзюме. Аўтар характарызуе навуковую спадчыну Г.М. Курыловіч і яе ўклад у развіццё айчыннай этналогіі. Увага звернута на біяграфічныя звесткі даследчыцы, яе ўнёсак у распрацоўку прыярытэтных навуковых тэм, а таксама ключавыя публікацыі па разнастайных аспектах культуры беларусаў.

Keywords: researcher, belarusian ethnology, culture of Belarusians.

Summary. The author characterizes the scientific heritage of Hanna Kurylovich and her contribution to the development of national ethnology. Attention is drawn to the biographical data of the researcher, her contribution to the development of priority scientific topics, as well as key publications about various aspects of belarusian culture.

Ганна Мікалаеўна Курыловіч прысвяціла айчыннай этналогіі больш за сорак гадоў. Нямногія ведаюць, што ў навуку яе прывялі спевы. Валодаючы добрымі галасавымі дадзенымі і вострым слыхам, яна яшчэ ў дзяцінстве захапілася народнымі песнямі. Іх спявалі аднавяскоўцы ў час каляндарных і сямейных абрадаў, у час працы і адпачынку, з любой нагоды і проста «для душы» [5, с. 3]. Песні роднай вёскі Загор'е, што на Светлагоршчыне, вылучаліся надзвычайнай маляўнічасцю, тэмбральнай насычанасцю, дыялектнай своеасаблівасцю. З песенных сюжэтаў Ганна Мікалаеўна пачала сваё блізкае знаёмства з традыцыйнай культурай беларусаў, што пазней і вызначыла яе жыццёвы і прафесійны шлях.

Даследчыца нарадзілася 23 верасня 1938 г. на Гомельшчыне ў сям'і калгасніка. Скончыўшы ў 1956 г. школу, яна непрацяглы час працавала загадчыцай вясковай бібліятэкі. А ўжо праз год здзейсніла сваю мару – паступіла ў Дзяржаўны народны хор БССР пад кіраўніцтвам вядомага харавога дырыжора, музыказнаўцы, фалькларыста, этнографа Генадзя Іванавіча Цітовіча. Падчас працы ў калектыве Ганна Мікалаеўна прайшла неабходную для прафесійнай спявачкі падрыхтоўку, а яе зацікаўленасць і веды ў галіне народнай песні і песеннай культуры Беларусі значна пашырыліся. Гэта, у сваю чаргу, паўплывала на тое, што ў 1961 г. яна вырашае паралельна паступіць на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Праз пяць гадоў Ганна Мікалаеўна паспяхова завяршыла навучанне на аддзяленні беларускай мовы і літаратуры названага факультэта, абараніўшы дыпломную работу «А. Русак і сучасная беларуская песня», падрыхтаваную пад кіраўніцтвам Г.І. Цітовіча. Характарыстыку за яго подпісам Г.М. Курыловіч атрымала, калі вырашыла звязаць свой далейшы лёс з навукай. У ёй адзначалася: «За время нахождения

в государственном народном хоре БССР А. Курилович была дисциплинированной, трудолюбивой, скромной в быту артисткой. Думается, что и на научной работе А. Курилович проявит себя самым лучшим образом, залогом чему является ее общее развитие и любовь к белорусской народной культуре» [6]. Так, у 1967 г. яна стала малодшым навуковым супрацоўнікам сектара этнаграфіі ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР. На рахунку Г.М. Курыловіч у самым пачатку яе працы на навуковай ніве быў адзіны артыкул «Гэта песня наша», надрукаваны ў часопісе «Маладосць» [3], а ўжо праз дваццаць гадоў спіс яе навуковых публікацый утрымліваў не адзін дзясятак пазіцый. Сярод іх аўтарская манаграфія, раздзелы ў калектыўных працах, унушальная колькасць артыкулаў у навуковых зборніках, энцыклапедыях, часопісах і газетах. Сярод навуковых тэм, якія ўздымаліся ў працах Г.М. Курыловіч фігуруюць самыя разнастайныя аспекты традыцыйнай культуры беларусаў, аднак значная іх частка ўсё ж такі звязана з матэрыяльнай спадчынай. І для гэтага ёсць аб’ектыўныя падставы. Справа ў тым, што на момант з’яўлення даследчыцы ў Акадэміі навук традыцыйная матэрыяльная культура беларусаў была адным з прыярытэтных накірункаў этналагічных даследаванняў. Г.М. Курыловіч разам з акадэмічнымі калегамі збірала матэрыялы аб разнастайных баках гэтай часткі культуры, імі былі зафіксаваны, ахарактарызаваны і перададзены ў музеі Беларусі шматлікія яе ўзоры, якія знаходзіліся пад пагрозай знікнення, былі падрыхтаваны першыя спецыяльныя даследаванні па праблеме, сфармуляваны арыгінальныя канцэпцыі.

Адным з першых навуковых заданняў, дзе Г.М. Курыловіч мела магчымасць праявіць сябе як пачынаючы даследчык, стала праца над тэмай «Рэгіянальны гістарычна-этнаграфічны атлас Украіны, Беларусі, Малдавіі». Гэта была частка глабальнага навуковага праекту па стварэнню спецыяльных прац, якія ахоплівалі усе вобласці традыцыйнай культуры народаў СССР. Атласы разглядаліся як адзін з важнейшых відаў абагульняючых работ, якія б падсумоўвалі дасягненні этнаграфічнай навукі і ўводзілі іх у даступнай форме ў навуковы зварот. Г.М. Курыловіч працавала над раздзелам «Адзенне» сумесна з калегамі – Л.А. Малчанавай, В.М. Бялявінай і інш. Імі былі сабраны каштоўныя палявыя матэрыялы, апрацавана шмат музейных і архіўных крыніц. Яны картаграфавалі і апісвалі касцюмныя комплексы, асобныя іх часткі, матэрыялы, асаблівасці нашэння, дэкору. Сам атлас не быў надрукаваны, аднак сабраныя матэрыялы былі выкарыстаны для падрыхтоўкі спецыяльнай манаграфіі па праблеме – «Беларускае народнае адзенне» (1975) [1]. Гэтая праца стала цудоўным даследчым вопытам для Г.М. Курыловіч, вызначыла напрамак, у якім варта і цікава было б рухацца далей. Ганна Мікалаеўна паступае ў завочную аспірантуру па спецыяльнасці «этнаграфія». Яе навуковым кіраўніком стаў вядомы беларускі этнолаг, член-карэспандэнт АН БССР, доктар гістарычных навук Васіль Кірылавіч Бандарчык. У якасці тэмы дысертацыйнага даследавання Г.М. Курыловіч абірае традыцыі беларускага ткацтва. У аснову работы былі пакладзены экспедыцыйныя

матэрыялы, якія даследчыца збірала па спецыяльна распрацаванаму апытальніку. Ён уключаў пытанні па апрацоўцы сыравіны, прадзенню, ткацкіх прыладах, тэхніцы вытворчасці тканін, іх арнаментацыі і г.д. Акрамя таго, у экспедыцыях быў сабраны багаты ілюстратыўны матэрыял. Усё гэта дало Ганне Мікалаеўне магчымасць не толькі паспяхова абараніць у 1979 г. кандыдацкую дысертацыю, але і апублікаваць у 1981 г. першую ў айчыннай этналагічнай навуцы працу, прысвечаную ткацтву [2]. Аўтарам ахарактарызаваны асноўныя працэсы беларускага ткацтва, яго разнастайнасць і багацце, сацыяльная значнасць і месца ў мастацкай спадчыне беларускага народа [4]. Г.М. Курыловіч паказала развіццё ткацтва з сярэдзіны XIX ст. да 1980-х гг., выявіла агульныя рысы ў ткацтве беларусаў і іншых славянскіх этнасаў, ахарактарызавала сыравіну і спосабы яе апрацоўкі, тэхнікі вырабу тканін, іх арнаментальныя і колеравыя рысы, выкарыстанне і арэалы распаўсюджання ткацкіх прылад працы. На падставе часткі сабраных матэрыялаў даследчыцай таксама былі падрыхтаваны асобныя раздзелы аб ткацтве ў шэрагу калектыўных выданняў – «Помнікі этнаграфіі» (1981), «Рамёствы і промыслы Беларусі» (1984), «Полесье. Материальная культура» (1988, сумесна з А.Т. Несцер).

За час працы ў ІМЭФ Г.М. Курыловіч прымала актыўны ўдзел у выкананні цэлага шэрагу навуковых тэм, што, безумоўна, патрабавала адпаведнай кваліфікацыі, бо многія з іх не былі напрамую звязаны з ткацтвам ці ў цэлым з матэрыяльнай культурай. Сярод іх адзначым наступныя: «Новые явления в быту и культуре сельского населения Беларуси», «Новые явления в быту и культуре трудящихся БССР», «Новые праздники и обряды в семейной и общественной жизни населения БССР», «Очерки духовной и материальной культуры белорусов», «Методологические и научно-методические основы Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта», «Состояние и пути совершенствования советской обрядности в БССР», «Духовная культура: семейный и общественный быт, обычаи и обряды», «Белорусы» и др. За перыяд працы на ніве айчыннай этналогіі Г.М. Курыловіч даследавала такія пытанні, як традыцыйныя промыслы і рамёствы, народная архітэктура, традыцыі харчавання, развіццё садоўніцтва, беларуская сям'я, этнічныя групы на Беларусі і інш. Яны знайшлі адлюстраванне ў шматлікіх аўтарскіх публікацыях даследчыцы і калектыўных выданнях. Напрыклад, «Памятники народной архитектуры» (1979), «Общественный и семейный быт населения Полесья» (1987), «Праздники и обряды в Белорусской ССР» (1988), «Этнаграфія Беларусі. Энцыклапедыя» (1989), «Белорусы» (1998), «Беларусы. Сям'я» (Т. 5, 2001), «Народная культура Беларусі: энцыклапедычны даведнік» (2002) і інш.

Напрыканцы 2010 г. Г.М. Курыловіч завяршыла працу ў Акадэміі навук і пайшла на пенсію. За гады, праведзеныя ў ІМЭФ, даследчыца працавала на розных пасадах: і малодшым навуковым супрацоўнікам аддзела этнаграфіі, і намеснікам загадчыка названага аддзела, і яго загадчыцай (2004–2006), некалькі гадоў з'яўлялася супрацоўнікам аддзела архітэктуры, была членам Вучонага савета па абароне дысертацый Д 01.42.01. Шматгадовая

праца Г.М. Курыловіч на ніве айчыннай этналогіі прадэманстравала яе павагу да навукі, шчырую самаадданасць у даследаванні праблем народнай культуры. Асоба даследчыцы справядліва стала важнай часткай цэлай эпохі ў гісторыі беларускай этналагічнай навукі.

Літаратура


1. Беларускае народнае адзенне / Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору ; рэд. В.К. Бандарчык. – Мінск : Навука і тэхніка, 1975. – 94 с.
2. Курилович, А.Н. Белорусское народное ткачество / А.Н. Курилович. – Минск : Наука и техника, 1981. – 119 с.
3. Курыловіч, Г.М. Гэта песня наша / Г.М. Курыловіч // Маладосць. – 1967. – №1. – С. 143–146.
4. Навагродскі, Т., Хоціна, А. Даследчыца скарбаў народных / Т. Навагродскі, А. Хоціна // Веды. – 25 чэрвеня 1998. – №33–34 (36–37). – С. 2.
5. Песні беларускага народа : метадычны зборнік / уклад. і ўступ. арт. І.В. Казаковай. – Мінск: Паркус плюс, 2007 – 68 с.
6. Характеристика на бывшую артистку Государственного народного хора БССР А.Н. Курилович (1967 г.) // Личное дело №25. Курилович Анна Николаевна. – Национальная академия наук. ГНУ «Институт искусствоведения, этнографии и фольклора им. К. Крапивы». – Лист 6.